Інфармацыйны ліст № 1

**Паважаныя калегі!**

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі запрашае Вас прыняць удзел у працы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі

**«Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў 2024 годзе»**

Асноўныя накірункі працы канферэнцыі:

1. Археалагічныя даследаванні помнікаў каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў.
2. Археалагічныя даследаванні помнікаў эпохі Сярэднявечча і Новага часу.
3. Ахоўныя мерапрыемствы ў зонах земляных і будаўнічых работ, інвентарызацыя помнікаў археалогіі.
4. Вынікі камеральных даследаванняў і рэстаўрацыйных мерапрыемстваў.

**Тэрмін правядзення канферэнцыі:** 14 – 16 мая 2025 г.

**Месца правядзення канферэнцыі:** пленарнае пасяджэнне – г. Навагрудак; праца секцый – г. Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Трансфер па маршруце г. Мінск – г. Навагрудак – г. Мінск за кошт арганізатараў канферэнцыі.

**Форма даклада** – вусная, стэндавая.

Прыняць удзел у працы канферэнцыі можна як вочна, так і online.

**Рэгламент выступленняў:** на пленарным пасяджэнні – да 30 хвілін, на секцыях – да 20 хвілін.

**Працоўныя мовы канферэнцыі:** беларуская, руская, англійская.

Тэрмін падачы заяўкі ў аргкамітэт: **да 10 красавіка 2025 г.**

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца ў **рэжыме online** па адрасе заяўка ці па QR-коду. Тэзісы дакладаў (да 3 тыс. знакаў) прымаюцца **да 10 красавіка 2025 г.** у электронным выглядзе на адрас polevaja.conference@gmail.com. Зборнік тэзісаў дакладаў будзе надрукаваны да пачатку працы канферэнцыі.

Тэзісы дакладаў павінны мець наступную структуру: назва, аўтар/аўтары, ключавыя словы (3-5 слоў), тэкст, які раскрывае змест працы, праблемы аб’екта, мэты, асноўныя метады і галоўныя вынікі. Усе атрыманыя матэрыялы пройдуць навуковае рэцэнзаванне, па выніках якога **Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў, а таксама пераносу часткі з іх у стэндавую форму.**

Камандзіровачныя выдаткі ўдзельнікаў канферэнцыі ажыццяўляюцца за кошт камандзіруючага боку.

З павагай,

Арганізацыйны камітэт канферэнцыі